што казкі будуюцца не на пяску» [1]. Марыя, якая «не належыць да пароды коцікаў», раскрывае рамантычнаму госцю сваю сапраўдную сутнасць:

– Вы зусім не такая сёння, – ціха сказаў ён. – Вы такая пакорлівая лёсу, і гэтаму небу, і мору.

– Так, – сказала яна. – Можна хоць тут апусціць рукі, адчуваць сябе звычайнай, слабай дзяўчынай [1].

Зачараваны душэўнай глыбінёй, справядлівасцю і міласэрнасцю Марыі, Лявон не хоча губляць сувязь з актрысай – яго апаноўваюць рамантычныя пачуцці, і дзяўчына адказвае ўзаемнасцю.

Як бачым, у апавяданні «Лятучы Галандзец» У. Караткевіч стварае сітуацыю, у якой ілюзорнае становіцца рэальным, недарэчны жарт аказваецца пачаткам вялікай гісторыі кахання. Рамантык, як і яго герой, пісьменнік сцвярджае аптымістычную інтэнцыю: у жыцці таго, хто не расчароўваецца, а верыць у лепшае, абавязкова з'явіцца свой карабель і прынясе чаканае шчасце.

**Бібліяграфічны спіс:**

1. Караткевіч, У. Лятучы Галандзец [Электронны рэсурс] / У. Караткевіч // Беларуская палічка : беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Uladzimir_Karatkievic/Latucy_Halandziec.html.– Дата доступу: 02.04.2023.

2. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. Рагойша. – Мінск : Беларус. Энц., 2001. – 384 с.

3. Flying Dutchman [Electronic resource] // Wikipedia : The free encyclopedia. – Mode of access: https://en.wikipedia.org/wiki/Flying_Dutchman. – Date of access: 02.04.2023.

## ІКОНЫ СТАРАДАРОЖЧЫНЫ ЯК НЯМЫЯ СВЕДКІ ГІСТОРЫІ

***А. С. Дамарад***

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – І. М. Мішчанчук, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца асаблівасці ікон Старадарожскага раёна як культурных артэфактаў, вызначаецца іх роля ў духоўна-маральным выхаванні асобы.

**Ключавыя словы:** ікона; храм; Свяшчэннае Пісанне; сюжэт іконы; жывапіс.

Бацькі ахрысцілі мяне па праваслаўным звычаі. Храм у аграгарадку Пасека з'явіўся дзякуючы нашаму земляку, пісьменніку Аляксандру Мікалаевічу Усене – выдаўцу, мецэнату шматлікіх дабрачынных спраў, які падараваў мне сваю кнігу «Грэх». Асаблівая ўвага ў ёй звяртаецца на подзвіг мучаніц Веры, Надзеі і Любові, трох дзяўчын, якія ў II стагоддзі па загадзе рымскага імператара Адрыяна былі закатаваны, бо не пажадалі адрачыся ад Хрыста і маці Сафіі. Менавіта імя гэтых Святых носіць наш храм.

У праваслаўных храмах Старадарожскага раёна, сядзібах пасечукоў я бачыла шматлікія іконы, а поруч з імі – ручнікі-набожнікі, пакрытыя тканымі ці вышыванымі ўзорамі, і мне вельмі захацелася даведацца аб гісторыі некаторых ікон, іх прызначэнні, аб тым, чаму ручнік суседнічае з іконай у храме і сялянскай хаце.

Калі чалавек уваходзіць у праваслаўны храм, са сцен на яго глядзяць Лікі Ісуса Хрыста, Божай Маці, Святых, якія належаць вечнасці. Кожная ікона мае сваю гісторыю, у ёй закладзены апавядальны сэнс і сюжэт. Старадаўнія іконы разам з храмам, вёскай перажывалі ўсе падзеі і перыпетыі часу. Гарэў храм, гарэла яго начынне. Ішла вайна – іконы выносілі з храма, кралі, палілі, знішчалі, як людзей і будынкі.

У Залужскім храме Святога Георгія Перамаганосца матушка Вольга Пігаль паказала маленькую ікону «Скарбячая Прасвятая Багародзіца», якую ў савецкі час вынеслі з царквы і скралі, але тыя, каму яна трапіла ў рукі, палічылі сваім абавязкам вярнуць ікону. Існуе версія, што ў іх сям'і здарылася няшчасце, таму нехта ім параіў: гэта ікона храмавая – яе патрэбна аддаць храму.

Калі разгледзець уважліва ікону, то можна знайсці прыкметы, якія прыблізна ўказваюць на час яе вырабу. Напісана яна па дрэве-леўкасе па старажытнай тэхналогіі. Малюнак наносіўся альбо танюсенькім пэндзлем, альбо іголкай, потым ікону размалёўвалі яечнай тэмперай [1]. Зверху ён пакрыты натуральнай аліфай, але з цягам часу на ёй з'явілася жаўцізна, што сведчыць аб яе даўнасці.

Сюжэт іконы распавядае, што Багародзіца ў ззянні мандорлы смуткуе разам з людзьмі, дапамагае ім. Злева – апрананне голых, а справа – вылячэнне багатых. У літаратуры сюжэт тлумачыцца наступным чынам: «Святые на иконах показывают нам путь к духовному преображению, облагораживают» [4, с. 4].

Ікону, па ўсёй верагоднасці, пісаў манах-адзіночка ў манастырскай келлі. Бачна, што іканапісец абапіраўся на руска-візантыйскія традыцыі, якія былі распаўсюджаны ў X–XII ст., і цалкам выканаў царкоўны канон пры стварэнні абраза: фігура Багародзіцы, як і іншых персанажаў, выцягнутая вертыкальна, пляскатая.

На тыльным баку іконы, які так і называецца «затыль», – сапраўдная знаходка: пісьмёны, надрапаныя вострым прадметам («Ивану скорбящу хороше рабе (или рабу) зачатия Анну полницу ризу чекану Атиста (не чытаецца) потольще»), замест літары «я» ў якіх ужываецца літара «юс малы», якая лічыцца яе адпаведнікам. Злева надрапаны знак, падобны на лацінскую VIII, тут жа прысутнічае яшчэ адзін нейкі загадкавы знак, падобны на арабскія лічбы.

Што хацелі данесці да нас папярэднікі? Безумоўна, нейкія важныя звесткі, у надпісе згадваецца «..ризу чекану..», а рыза – гэта «адзенне» для іконы [3, с. 3]. У дадзеным выпадку, відавочна, чаканны аклад сарвалі рабаўнікі, бо верагодна, ён быў з каштоўнага металу.

У Пасецы ў храме Святых пакутніц Веры, Надзеі, Любові і іх маці Сафіі каля ўвахода знаходзіцца ікона аднаго з найбольш шануемых у славян хрысціянскіх Святых Міколы Цудатворца, якую падаравалі храму ў год яго асвячэння (2000). Настаяцель храма Аляксандр Понтус патлумачыў, што яе задача – перадаць вобраз Святога, каб веруючы мог аб’яднацца ў дыялозе і зносінах з ім.

Гэты твор мастацтва спалучае рысы іконы і жывапіснай карціны: пры яе напісанні выкарыстоўваўся прыём светлацені. Зблізку можна разгледзець расколінкі, што ўтварыліся на фарбе з цягам часу. Твар Міколы Цудатворца выглядае адухаўлёным, позірк – пранікнёным, постаць – як жывая, яго правая рука прыўзнята ў бласлаўлёным жэсце, а ў другой ён трымае Святое Евангелле. Адзначаюць, што «Святой прозрачен, как промытое стёклышко, и за этим стеклом мы должны видеть Христа» [2, с. 3].

У гэтай жа царкве знаходзіцца надзвычай прыгожая ікона Божай Маці ў металічным акладзе, якую падаравала храму жыхарка вёскі Рухава, што побач з Пасекай. Багародзіца трымае на руках свайго Сына – маленькага Ісуса Хрыста. Старадаўняя ікона з’яўляецца сапраўднай пярлінай пасецкага храма: разны драўляны кіёт на ёй пакрыты фарбай залатога колеру і з’яўляецца ўзорам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У царкве Свяціцеля Мікалая Цудатворца ў Старых Дарогах таксама ёсць свая рэліквія – Казанская ікона Божай Маці, адна з самых шануемых ікон у праваслаўі. Настаяцель храма Ігар Кручко сцвярджае, што гэта самая старажытная ікона на старадарожскай зямлі: час яе стварэння – прыблізна XVII ст. Ікону ў храм прынёс чалавек, які пажадаў застацца невядомым, бо добрыя справы патрэбна рабіць моўчкі і не чакаць за гэта ні славы, ні ўзнагароды. Можна заўважыць, што мастаком у вобразе Божай Маці перададзены народны славянскі тып знешнасці, рысы характару і беззаганнасць. Адсюль можна зрабіць выснову, што славяне праецыруюць усіх сваіх святых на славян.

Такім чынам, у абразах адлюстроўваецца асаблівасці менталітэту народа. Святы вобраз становіцца бліжэй да чалавека, калі ён мае фізічнае падабенства з ім, а вернікі атаясамліваюць сябе са святымі на іконах.

На Старадарожчыне захаваліся іконы-старажылы – нямыя сведкі гістарычных падзей, якія адбываліся на нашай зямлі. Яны маюць агульны лёс з храмам, вёскай, насельнікамі краю і з’яўляюцца рарытэтамі.

**Бібліяграфічны спіс:**


1. Амфилохиева, Е. В. Изобразительное искусство : полная энциклопедия / Е. В. Амфилохиева. – М. : ЭКСМО, 2016. – 256 с.
2. Дашкевіч, В. Да веры сваім шляхам / В. Дашкевіч // Навіны Старадарожчыны. – 1993. – 8 мая – С. 3.
3. Крючко, И. Храм, и как вести себя в нем / И. Крючко // Новости Стародорожчины. – 1994. – 14 декабря. – С. 3.
4. Фяксель, И. Человек чистой души радуется всему, особенно природе, плодам своего труда и радости другого человека… / И. Фяксель // Новости Стародорожчины. – 2015. – 14 марта. – С. 4.


## МАДЫФІКАЦЫІ АЎТАРСКІХ УСХОДНІХ ВЕРШАВАНЫХ ЖАНРАВЫХ ФОРМ У СУЧАСНАЙ ПАЭЗІІ


***А. А. Дзенісевіч***

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – І. М. Мішанчук, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*



**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца аўтарскія жанравыя формы, падобныя да ўсходніх: ясачкі, зномы, квантэмы, пункціры, акварэлі, кропелькі.



**Ключавыя словы:** жанравая дыфузійнасць; вершаваныя формы; аўтарскія мініяцюры; наватворы.


Мастацтва паэзіі, знаёмае чалавецтву яшчэ з біблейскіх часоў, пастаянна развіваецца. Мэта паэзіі – максімальна поўна асвятліць стан чалавечай душы, не выходзячы пры гэтым са строгіх формаў вершаванага жанру. Аднак многія паэты шукаюць новыя вершаваныя формы, якія маглі б з нечаканага боку раскрыць і іх паэтычны дар, і саму мову.

У сучаснай беларускай паэзіі сустракаюцца арыгінальныя паэтычныя мініяцюры, сэнсава ці фармальна падобныя да ўсходніх вершаў. У кожнага паэта яны, звычайна, маюць свае жанравыя і фармальныя адметнасці, а таксама асаблівыя назвы: у Алеся Разанава – пункціры і квантэмы, у Рыгора Барадуліна –